і матэрыялаў для прыпякання іх на паверхнях дэталей машын.

*Тв.*: Упрочнение и восстановление деталей машин металлическими порошками. Мн., 1975; Центробежное припекание порошковых покрытий при переменных силовых воздействиях. Мн., 1993 (у сааўт.).

**ДАРО́ЖНА-БУДАЎНІ́ЧЫЯ МАТЭРЫ́ЯЛЫ**, будаўнічыя матэрыялы (вырабы), якія выкарыстоўваюцца пры буд-ве *аўтамабільных дарог*, пакрыццяў вуліц і плошчаў. Падзяляюцца на грунтавыя (*гліны, суглінкі, пяскі, супескі*), каменныя прыродныя (*жвір, бутавы камень, друз, брусчатка* і інш.) і штучныя (*асфальтабетон*, цэментны і палімербетон і інш.), керамічныя (*клінкер*, тратуарныя пліткі, цагляны друз, трубы для дрэнажу), шлакавыя (шлакавы друз, адлітыя з шлакавага расплаву камяні і пліты), арган. і мінер. вяжучыя рэчывы (*бітум, дзёгаць, гудрон, смолы, пакосты; цэмент, вапна, гіпс*), *бетоны* і вырабы з іх, палімерныя матэрыялы (ідуць пераважна на плёнкаўтваральныя ахоўныя пакрыцці і умацавальныя дабаўкі да грунтоў). Гл. таксама *Будаўнічых матэрыялаў прамысловасць.*



Да арт. **Дарожна-будаўнічыя работы**. Будаўніцтва цэментна-бетоннага дарожнага пакрыцця (укладка сумесі на падрыхтаванае земляное палатно).



Да арт. **Дарожна-будаўнічыя работы**. Укладка ахоўнага слоя дарожнага пакрыцця (размеркаванне друзу па слоі бітуму).




**Дарожнае адзенне**: 1 — дадатковы слой асновы; 2, 3 — слаі асновы; 4, 5 — ніжні і верхні слаі дарожнага пакрыцця.

**ДАРО́ЖНА-БУДАЎНІ́ЧЫЯ РАБО́ТЫ**, комплекс работ па будаванні *аўтамабільных дарог*, пакрыццяў вуліц, плошчаў і інш. аб'ектаў дарожна-трансп. прызначэння. Падзяляюцца на падрыхтоўчыя, асноўныя, дапаможныя і заключныя.

П а д р ы х т о ў ч ы я  р а б о т ы — расчыстка дарожнай паласы, уладкаванне пад'ездаў, буд. пляцовак, часовых вытв. і інш. збудаванняў; а с н о ў н ы я  р а б о т ы — нарыхтоўчыя (здабыча ў *кар'ерах* і апрацоўка каменных і інш. *дарожна-будаўнічых матэрыялаў*, выраб на спецыялізаваных прадпрыемствах бетоннай сумесі, дарожных пліт, труб, маставых канструкцый і інш.) і буд.-мантажныя (узвядзенне *землянога палатна*, укладка *дарожнага адзення*, буд-ва *тунэляў, пуцеправодаў, мастоў*, інж. ўладкаванне дарогі, устаноўка *знакаў дарожных*, агароджы і інш.); д а п а м о ж н ы я  р а б о т ы — *мантаж* і дэмантаж тэхнал. установак, перанос ліній сувязі і інш.; з а к л ю ч н ы я  р а б о т ы — *рэкультывацыя зямель*, ліквідацыя часовых пабудоў, выдаленне буд. адходаў і смецця. Адрозніваюць таксама лінейныя работы (з раўнамерным размеркаваннем аб'ёмаў работ па трасе дарогі) і сканцэнтраваныя (напр., буд-ва трансп. развязак, мастоў, будынкаў); *земляныя работы, бетонныя работы*, грунтаўмацавальныя, гідраізаляцыйныя і інш. Механізацыя Д.-б.р. забяспечваецца выкарыстаннем агульнабуд. (гл. *Будаўнічыя машыны*) і дарожна-буд. машын (гл. *Дарожныя машыны*).

*Літ.*: Технология и организация строительства автомобильных дорог. М., 1992.

*І.І.Леановіч.*

**ДАРО́ЖНАЕ АДЗЕ́ННЕ**, шматслойная канструкцыя праезнай ч. *аўтамабільнай дарогі*, прызначаная ствараць роўную, трывалую і шурпатую паверхню для руху трансп. сродкаў. Успрымае нагрузку ад колаў машын, перадае яе ў разгрупаваным выглядзе на *земляное палатно*, ахоўвае яго ад увільгатнення і прамярзання.

Д.а. складаецца з дарожнага пакрыцця і адна- або шматслойнай асновы. Д а р о ж н а е  п а к р ы ц ц ё бывае ўдасканаленае капітальнае (цэмента- або асфальтабетоннае, мазаічнае і брусчатае маставое на трывалай аснове), удасканаленае аблегчанае (чорнае друзавае і чорнае жвіровае на аснове з каменных матэрыялаў), пераходнае (грунтадрузавае, грунтажвіровае і грунтавое, умацаванае вяжучымі матэрыяламі, маставое з колатага каменю), ніжэйшае (грунтавое, палепшанае дамешкамі жвіру, друзу або пабудаванае з аптымальных грунтавых сумесей). А с н о в у  а д з е н н я робяць з цэмента- і асфальтабетону, шчэбеню, гравію, з грунтоў, умацаваных вяжучымі рэчывамі і інш. Можа мець гідра- або цеплаізаляцыйныя праслойкі, трубчасты дрэнаж. У Беларусі дарогі агульнага карыстання маюць Д.а. (1997, у %): цэментабетоннае 3,5, асфальтабетоннае 63,5, чорнае жвіровае і чорную шашу 3, белую шашу 0,1, маставое 0,5, жвіровае 29,4.

*І.І.Леановіч.*

**ДАРО́ЖНЫ** (сапр. С е р а д а) Сяргей Міхайлавіч (25.2.1909, г. Слонім Гродзенскай вобл. — 19.7.1943), бел. паэт. Скончыў БДУ (1930). Працаваў на гуце ў Барысаве, у рэдакцыях газет і часопісаў. У 1936 рэпрэсіраваны. Пакаранне адбываў на Д. Усходзе, будаваў Камсамольск-на-Амуры. Там і загінуў. Рэабілітаваны ў 1957. Друкаваўся з 1925. Аўтар зб. вершаў «Звон вясны» (1926, з І.Плаўнікам), «Васільковы россып» (1929), «Пракосы на памяць» (1932). Узнёсла-рамантычна славіў сацыяліст. буд-ва, пісаў пра рэв. барацьбу працоўных Зах. Беларусі, паэтызаваў родную прыроду. Паэзія Д. вылучаецца спавядальнай шчырасцю, свежасцю метафарычнай вобразнай фактуры, мілагучнасцю радка. У некат. вершах адчуваецца ўплыў паэтыкі У.Дубоўкі. Пераклаў на бел. мову раман Г.Караваевай «Лесазавод», вершы Э.Багрыцкага, С.Кірсанава, А.Твардоўскага, І.Уткіна, І.Харыка і інш., апавяданні У.Караленкі, А.Новікава-Прыбоя і інш.



С.Дарожны.

*Тв.*: Выбр. вершы. Мн., 1966.

*Літ.*: Наднёманскія былі. Мн., 1968. С. 39—41; Ш у ш к е в і ч С. Ён песню насіў у грудзях... // Шушкевіч С. Выбр. тв. Мн., 1978. Т. 2.

*І.У.Саламевіч.*

**ДАРО́ЖНЫ ПРАСВЕ́Т**, к л і р э н с, адлегласць ад найніжэйшага элемента канструкцыі аўтамабіля (акрамя колаў) да ўзроўню зямлі (апорнай плоскасці); адзін з паказчыкаў праходнасці машыны. Д.п. легкавых аўтамабіляў 170—210 мм, аўтобусаў 180—340 мм, грузавых аўтамабіляў 220—540 мм.

**ДАРО́ЖНЫЯ ВО́ЙСКІ**, спецыяльныя войскі, прызначаныя для выканання задач дарожнага забеспячэння. Складаюцца з дарожна-каменданцкіх, дарожна-буд., мостабуд. і інш. часцей і падраздзяленняў; забяспечваюцца тэхн. сродкамі для ўзнаўлення разбураных участкаў аўтадарог, мастоў, а таксама спец. абсталяваннем і транспартам для забеспячэння руху. У рус. арміі з'явіліся ў пач. 18 ст., у Сав. Узбр. Сілах — у час грамадз. вайны.

**ДАРО́ЖНЫЯ ВО́СЫ** (Pompilidae), сямейства вос падатр. сцябліністабрухіх перапончатакрылых насякомых. Больш за 3 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў тропіках. На Беларусі 24 віды, з іх сярод камянёў і раслін на пясчаных дарогах найб. трапляюцца пампіл дарожны (Pompilus viaticus), павукалоў буры (Priocnemis fuscus).

Даўж. 3—25 мм. Пярэдняспінка развітая, брушка кароткае, сцяблінстае. Малюнак цела чорны або чорны з чырвоным ці жоўтым. Ногі доўгія, пярэдняя часта з капальным грэбенем. Палююць на павукоў. Большасць з іх